УДК 94(476)«1918/1929»

**К.Р. Карпекін**

# Антырэлігійная палітыка савецкай улады ў дачыненні да іудзейскіх культавых аб’ектаў на Віцебшчыне ў 1918–1929 гг.

З усталяваннем савецкай улады на тэрыторыі былой Расійскай імперыі былі абвешчаны новыя прынцыпы правядзення канфесійнай палітыкі. Усе канфесіі сталі лічыцца роўнымі паміж сабой, абвяшчалася свабода веравызнання. Ніводная канфесія не магла разлічваць на падтрымку з боку дзяржавы. Грамадзяне савецкіх рэспублік мелі права прытрымлівацца любой веры, але не выкарыстоўваць яе ў мэтах антысавецкай дзейнасці. Заканадаўчай базай такой палітыкі сталі дэкрэты СНК РСФСР «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных грамадствах» ад 20 студзеня 1918 г., «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» ад 23 студзеня 1918 г., інструкцыя Наркамата юстыцыі і Наркамата ўнутраных спраў «Па пытаннях, звязаных з правядзеннем у жыццё дэкрэта аб аддзяленні царквы ад дзяржавы» ад 19 чэрвеня 1923 г. Разам з тым савецкім урадам пачалі ажыццяўляцца актыўныя захады па аслабленні ўплыву рэлігіі на насельніцтва.

На тэрыторыі Беларусі пражывалі прадстаўнікі розных этнічных супольнасцяў. Самай шматлікай нацыянальнай меншасцю тут былі яўрэі, якія спавядалі іудаізм. Яўрэі кампактна пражывалі ў гарадах і мястэчках, таму ўся антырэлігійная дзейнасць кіруючых колаў канцэнтравалася менавіта ў гэтых населеных пунктах. Для працы сярод яўрэяў пры партыйных органах былі арганізаваны спецыяльныя яўрэйскія секцыі (яўсекцыі). Першай на тэрыторыі Беларусі ў 1918 г. была створана яўрэйская секцыя Віцебскага губернскага камітэта РКП(б). Адной з задач дзейнасці яўсекцый была ліквідацыя аб’ектаў, неабходных іудзеям для адпраўлення свайго культу. Да такіх аб’ектаў адносіліся сінагогі, міквы (басейны для рытуальных амавенняў) і могілкі.

Некаторыя аспекты этнаканфесійнай палітыкі савецкай улады ў адносінах да іудзеяў на тэрыторыі Беларусі даследаваліся беларускімі і замежнымі навукоўцамі. Працэс скарачэння колькасці сінагог, праблема выкарыстання зачыненых культавых будынкаў закраналіся ў працах А. Зэльцара [1], Л. Смілавіцкага [2], Д. Фішмана [3]. Таксама нельга не адзначыць шэраг публікацый у перыядычным друку, прысвечаных лёсу яўрэйскіх могілак Беларусі [4–5]. Разам з тым пералічаныя даследаванні не ствараюць цэласнага ўяўлення пра антырэлігійную палітыку савецкай улады ў адносінах да прадстаўнікоў іудзейскай веры, таму **мэта дадзенай працы** – высвятліць характар мерапрыемстваў дзяржавы ў дадзеным напрамку.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне ажыццяўлялася з дапамогай такіх **метадаў**, як аналіз, сінтэз, архіўная эўрыстыка.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Савецкая ўлада лічыла сінагогі асяродкамі не толькі рэлігійнага, але і грамадскага жыцця іудзейскіх абшчын. Імкнучыся зменшыць уплыў рэлігіі на насельніцтва, яна ажыццяўляла захады па **скарачэнні колькасці культавых будынкаў** [табл.].

Пачынаючы з 1918 г. і на працягу ўсіх 1920-х гг. фарміравалася заканадаўчая база, на аснове якой ажыццяўляліся адносіны савецкай улады да іудзейскай канфесіі. Забудовы, прызначаныя для набажэнстваў, перадаваліся рэлігійным абшчынам у бясплатнае карыстанне, але не валоданне. Тым самым вернікі пазбаўляліся права ўласнасці на культавыя будынкі. Органамі ўлады рабіліся захады па змяншэнні колькасці сінагог. Падставамі для закрыцця храма любой канфесіі былі недахоп памяшканняў для жыллёвых, медыцынскіх, культурных мэтаў, хадайніцтвы аб закрыцці з боку насельніцтва, антысавецкая дзейнасць вернікаў, злоўжыванне маёмасцю культавага будынка.

Табліца

**Колькасць дзеючых іудзейскіх культавых будынкаў на Віцебшчыне***

| Населены пункт | Колькасць | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1917 г. | 1918 г. | 1919 г. | 1920 г. | 1921 г. | 1922 г. | 1923 г. | 1924 г. | 1925 г. | 1926 г. | 1927 г. | 1928 г. | 1929 г. |
| Астроўна | 3 | – | 3 | – | – | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | – |
| Віцебск | 62 | – | – | – | – | 55 | 44 | 44 | – | – | 27 | – | – |
| Гарадок | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 7 | 7 | 7 | 7 | 7 | – |
| Калышкі | – | – | – | – | – | – | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | – |
| Полацк | 20 | – | – | – | – | 15 | 12 | – | – | – | – | – | – |
| Сіроціна | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| Шуміліна | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | – |
| Янавічы | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | – |
| Усяго па БССР | 704 | – | – | – | – | – | – | – | – | – | – | 592 | 547 |

У першай палове 1920-х гг. кампаніі па закрыцці сінагог мелі не дастаткова паслядоўны характар: яны не заўсёды былі звязаны з праводзімай антырэлігійнай прапагандай, органы мясцовай улады былі не ў стане выкарыстаць для заяўленых мэтаў усе зачыненыя будынкі.

Найбольш інтэнсіўна закрыццё сінагог ажыццяўлялася ў буйных гарадах. Часам, у адным населеным пункце магло быць зачынена адразу некалькі культавых будынкаў. Да прыкладу, у лютым 1921 г. у распараджэнне аддзела народнай асветы Віцебскага губернскага выканаўчага камітэта было аддадзена 5 сінагог (пазней 2 з іх былі прыстасаваны пад мастацкі тэхнікум, 2 – пад клубы піянераў і 1 – пад інтэрнат). Спачатку такое выкарыстанне сінагог афіцыйна меркавалася як часовае, але пазней яны так і не былі вернуты прыхаджанам. Сваю пазіцыю губернскія ўлады растлумачылі тым, што вышэй азначаныя культурна-асветныя ўстановы не было дзе размясціць, а для прыстасавання і добраўпарадкавання будынкаў былі затрачаны значныя грашовыя сродкі. На думку ўлад, у г. Віцебску дзейнічала дастатковая колькасць сінагог, якія маглі б змясціць ад 200 да 1000 чалавек. Да таго ж бальшавікі

* Табліца складзена аўтарам на аснове дакументаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

налічылі ў кожнай іудзейскай абшчыне г. Віцебска не больш як па 70 чалавек, таму прызналі функцыянаванне вялікай колькасці сінагог немэтазгодным [6]. Такія разважанні выклікаюць сумненні, бо паводле стану на 1923 г. у г. Віцебску пражывала амаль 40 тыс. яўрэяў.

У невялікіх гарадах і мястэчках Віцебшчыны гэты працэс насіў больш запаволены характар. Гэта тлумачыцца тым, што ў 1920-я гг. савецкі ўрад, клапоцячыся пра свой міжнародны аўтарытэт, не мог пазбавіць вернікаў пэўнага населенага пункта ўсіх без выключэння культавых будынкаў. У мястэчках жа колькасць сінагог была значна меншая, чым у буйных гарадах. Тым не менш, у некаторых выпадках мясцовыя ўлады рабілі мэтанакіраваныя захады па закрыцці канкрэтнай сінагогі. Як правіла, гэта былі самыя вялікія, каменныя будынкі. Паказальным з'яўляецца працэс ліквідацыі адной з сінагог у м. Сіроціна Віцебскага павета. У пачатку 1920-х гг. у мястэчку дзейнічала 3 сінагогі: Любавіцкая, Пясчанская і Хабадская. Першы крок быў зроблены 14 верасня 1923 г., калі Прэзідыум Віцебскага губернскага выканкама выдаў загад «Аб прадстаўленні адпаведных памяшканняў пад навучальныя пункты для ваеннай падрыхтоўкі працоўных». У выніку перад Віцебскім губернскім выканкамам валаснымі ўладамі было ўзбуджана хадайніцтва пра магчымасць адабрання ў іудзеяў адной з дзеючых у мястэчку сінагог і адначасова было аб'яўлена пра арганізацыю сходу вернікаў для высвятлення іх меркавання. Вернікі выказалі згоду добраахвотна перадаць культавы будынак пад навучальны пункт, але з умовай, што ім будзе паведамлены тэрмін звароту сінагогі.

Як аказалася пазней, навучанне дапрызыўнікоў было адкладзена, але тым не менш прадстаўнікі Віцебскага губернскага ваенкамата настойвалі на закрыцці адной з сінагог. Члены яўрэйскіх абшчын вырашылі кідаць жэрабя і такім чынам вызначыць сінагогу, якую можна будзе аддаць мясцовым уладам. Атрымалася так, што канфіскацыі падлягала Пясчанская сінагога. Па нявысветленых абставінах жыхары мястэчка выдалі прадстаўніку ваенкамата дазвол на закрыццё будынка сінагогі, але не Пясчанскай, а Хабадскай. У пачатку сакавіка 1924 г. яе дзверы былі запёртыя на замок, а сам будынак прадастаўлены ў выкарыстанне валасному выканкаму. Прыхаджане Хабадскай сінагогі спрабавалі аказаць некаторае супраціўленне: яны заявілі, што дазвол на закрыццё культавага будынка быў падпісаны асобамі, якія не мелі непасрэднага дачынення да іудзейскай канфесіі, а мерапрыемствы, што праводзіліся ў будынку зачыненай сінагогі, з'яўляліся зневажальнымі для вернікаў. Таксама іудзеі Хабадскай сінагогі накіравалі ў адміністрацыйны аддзел Віцебскага павятовага выканкама заяву, у якой прасілі вярнуць ім сінагогу для правядзення там набажэнстваў [7].

У чарговы раз лёс сінагогі вырашаўся на агульным сходзе яўрэяў м. Сіроціна 3 красавіка 1924 г. Спецыяльна абраная камісія з 7 чалавек зноў кідала жэрабя. «Ахвярай» стала Хабадская сінагога. Ужо 4 красавіка 1924 г. старшыня валаснога выканкама паведаміў у Віцебск, што пытанне з сінагогай вырашана ў канчатковай форме [8].

Як бачна, на працягу некалькіх месяцаў прадстаўнікам савецкай улады ўдалося зачыніць адну з трох сінагог м. Сіроціна. Яны дзейнічалі мэтанакіравана і яўна імкнуліся ліквідаваць менавіта Хабадскую сінагогу, якая была самай старой у мястэчку і вельмі цанілася вернікамі.

Менш шматлікімі былі выпадкі, калі вернікі мелі права выбару, якую сінагогу пакінуць у сваім карыстанні. Да прыкладу, у 1924 г. іудзеі г. Гарадка накіравалі ў Віцебскі акруговы выканкам ліст, дзе прасілі захаваць для правядзення набажэнстваў сінагогу, якую меркавалася прыстасаваць пад клуб. Вернікі запэўнівалі, што яна найбольш прыдатная для культавых мэт, а для клуба нязручная, бо знаходзіцца далёка ад вуліцы, у глыбіні двара. Да таго ж у ёй

меўся аб’ект гісторыка-культурнай вартасці – арон-кадэш (шафа для захавання світкаў Торы), аздоблены разьбой па дрэве, які пры рамонце альбо перавозцы мог быць значна пашкоджаны. Адначасова вернікі сцвярджалі, што на дадзены момант у горадзе ёсць некалькі свабодных будынкаў, якія можна было б выкарыстоўваць як клубныя памяшканні. У крайнім выпадку, прыхаджане гатовы былі аддаць іншую гарадоцкую сінагогу [9].

У 1929 г. пачало назірацца новае ажыўленне кампаній па закрыцці сінагог. Гэта было звязана з прыняццем 8 красавіка 1929 г. пастановы ВЦВК і СНК «Аб рэлігійных аб’яднаннях», у якой абвяшчалася пра рашучую барацьбу з усімі канфесіямі. Былі распрацаваны новыя падыходы да ліквідацыі культавых будынкаў. Перад закрыццём сінагогі мясцовыя ўлады імкнуліся правесці ўзмоцненую антырэлігійную прапаганду – мерапрыемствы кшталту дакладаў, лекцый для яўрэйскага насельніцтва. Само імкненне да закрыцця сінагог падавалася як ініцыятыва з боку пераважнай большасці насельніцтва канкрэтнага мястэчка ці горада. Таксама ліквідацыі культавых будынкаў папярэднічала аб’ектыўнае вывучэнне патрэб горада канкрэтнага населенага пункта ў памяшканнях для культурна-асветных, медыцынскіх і іншых устаноў. Такім чынам, кампаніі па ліквідацыі сінагог у 1929 г. ажыццяўляліся з тымі самымі мэтамі, але больш асцярожна, чым аналагічныя мерапрыемствы першай паловы 1920-х гг.

Яскравым прыкладам новых падыходаў з’яўляюцца захады віцебскіх акруговых улад па закрыцці некалькіх сінагог у г. Віцебску ў 1929 г. Дзейнасць Віцебскага акруговага выканаўчага камітэта была ўзгоднена з акруговым аддзяленнем «Саюза Бязбожнікаў». Найперш трэба заўважыць, што ліквідацыю культавых будынкаў планавалася ажыццявіць пасля свята Песах. Верагодна, прадстаўнікі мясцовай улады апасаліся моцнага абурэння вернікаў, таму закрыццё сінагогі было вырашана не прымяркоўваць да значнага ў канфесійных адносінах дня. У дадзеным выпадку агітацыйнасць і дэманстратыўнасць дзеяння саступіла месца абачлівасці. Таксама былі прыняты меры па праверцы наяўнасці фінансавых сродкаў для хуткага пераабсталявання сінагог. Улічваючы былы вопыт, прадстаўнікі савецкай улады вырашылі пазбегнуць патрабаванняў вернікаў пра зварот культавых будынкаў іудзейскім абшчынам. У маі 1929 г. да закрыцця было вылучана 8 віцебскіх сінагог. Пасля дэталёвага разгляду справы Цэнтральная Камісія па адлучэнні царквы ад дзяржавы ў чэрвені 1929 г. ухваліла адабранне ў вернікаў толькі 4 сінагог. Падставай дазволу да далейшага функцыянавання астатніх сінагог стала якраз адсутнасць рэальнай магчымасці правядзення там рамонтных работ і арганізацыі нейкіх культурных устаноў [10].

Адначасова з закрыццём сінагог і малітоўных дамоў савецкімі і партыйнымі органамі праводзілася **ліквідацыя мікваў** – спецыяльных басейнаў для рытуальнага амавення. У беларускіх гарадах яны маглі займаць як асобныя памяшканні, так і знаходзіцца ў грамадскіх лазнях. Адной міквай маглі карыстацца члены некалькіх абшын. Адразу пасля 1917 г. такія басейны функцыянавалі ў кожным раёне г. Віцебска, але пасля пераходу грамадскіх лазняў у веданне камунальных аддзелаў акруговых выканкамаў у 1925 г. амаль усе яны былі засыпаны зямлёй. Пасля гэтага некаторыя іудзейскія абшчыны горада хацелі пабудаваць новыя міквы. Яны дасылалі ў акруговы выканкам заявы, у якіх апелявалі да аўтарытэту Ленінградскага выканкама, які дазваляў іудзеям карыстацца сваімі міквамі. Затым віцебскія вернікі прасілі дазволу на стварэнне сабе новых рытуальных басейнаў. Каб пазбегнуць замаху на іх, месцы для будаўніцтва абіраліся на тэрыторыі двароў, дзе пражывалі сем’і іудзеяў. У некаторых выпадках вернікам быў дадзены дазвол на ўзвядзенне рытуальных басейнаў, у якіх указвалася, што будаўніцтва павінна

ажыццяўляцца з улікам усіх тэхнічных і санітарных патрабаванняў. На будаўніцтва адводзіўся пэўны тэрмін (1,5 месяца) [11]. У беларускіх мястэчках ролю міквaў выконвалі натуральныя вадаёмы (рэкі, азёры). Знішчыць іх было немагчыма. Такія абставіны спрыялі захаванню ў мястэчках іудзейскіх традыцый.

Непасрэдным чынам звязанымі з адпраўленнем іудзейскага культу былі яўрэйскія могілкі, якія знаходзіліся ва ўсіх гарадах і мястэчках Віцебшчыны. Паводле дэкрэта СНК РСФСР «Аб могілках і пахаваннях» ад 7 снежня 1918 г., усе могілкі пераходзілі ў распараджэнне мясцовых саветаў. Таксама павінны былі стаць на ўлік усе пахавальныя арганізацыі (гэта датычылася і хеўра-кадышаў – яўрэйскіх пахавальных брацтваў). Ужо ў першыя гады савецкай улады рабіліся **спробы мэтанакіраванага скарачэння колькасці могілак**. Гэтай акцыі надавалася вялікае ідэалагічнае значэнне. Увядзенне новых савецкіх абрадаў і іх паўсюдная уніфікацыя падразумявала адыход насельніцтва ад канфесійных абрадаў. На думку савецкіх улад, на тагачасных яўрэйскіх могілках адбываліся дзеянні, што супярэчылі здаровай логіцы: амаль усе яны былі перапоўнены, нябожчыкаў хавалі адно на адным. Для выпраўлення сітуацыі прапаноўвалася стварыць пры кожных могілках крэматорыі для спальвання целаў памерлых. Самі могілкі меркавалася абкружыць плотам ці глыбокім ровам і абавязкова абсадзіць дрэвамі.

Што датычыцца г. Віцебска, то ў 1919 г. Віцебская губернская секцыя па яўрэйскіх нацыянальных справах лічыла, што ў горадзе маецца празмерная колькасць яўрэйскіх могілак і гэта спрыяе росквіту дзейнасці хеўра-кадышаў. Выйсце яны бачылі ў закрыцці трох могілак, а адны меркавалася пакінуць для далейшага функцыянавання. Праўда, у 1919 г. у г. Віцебску панавала эпідэмія сыпнога тыфу, супраць закрыцця яўрэйскіх могілак актыўна выступаў загадчык аддзела аховы здароўя Віцебскага губернскага выканкама. Ён сцвярджаў, што гэта абавязкова выкліча замаруджанне працэсу пахавання памерлых і паспрыяе хутчэйшаму распаўсюджанню эпідэміі [12].

Надалей маёмасць значнай колькасці яўрэйскіх могілак падверглася агляду з боку прадстаўнікоў мясцовых улад, уся маёмасць была ўнесена ў спецыяльныя спісы. Савецкія ўлады не адмовіліся ад сваіх планаў па ліквідацыі яўрэйскіх могілак. Да прыкладу, у 1921 г. у г. Віцебску планавалася ператварыць у скверы ўсе могілкі, што мясціліся на тэрыторыі горада. Яўрэйскія могілкі, дзе амаль не было дрэваў, планавалася поўнасцю азеляніць [13]. У значна меншай ступені такая палітыка праводзілася ў мястэчках, бо там знаходзіліся, як правіла, толькі адны яўрэйскія могілкі.

Разам з указанай палітыкай савецкага ўраду адбывалася хаатычнае рабаванне месцаў пахавання мясцовым насельніцтвам, якое не належала да іудзейскага веравызнання. Надмагільныя пліты выкарыстоўваліся як будаўнічы матэрыял, для выбрукоўкі дарог.

**Заключэнне.** На працягу 1918–1929 гг. органы савецкай улады Віцебшчыны ажыццяўлялі комплекс разнастайных мерапрыемстваў, якія былі скіраваны на ліквідацыю сінагог, малітоўных дамоў, міквaў, могілак – аб’ектаў, неабходных для адпраўлення набажэнстваў. Дадзеныя захады ажыццяўляліся мэтанакіравана і планамерна на працягу ўсяго даследуемага перыяду. У той жа час трэба адзначыць, што антыіудзейскія кампаніі маштабней праводзіліся ў гарадах, дзе знаходзілася значна большая колькасць культавых аб’ектаў. У мястэчках Віцебшчыны пры наяўнасці агульных тэндэнцый па закрыцці сінагог і могілак кампаніі не набывалі такога размаху. Увогуле ж, мерапрыемствы па ліквідацыі культавых аб’ектаў іудзейскай канфесіі мелі больш глыбокае значэнне, чым проста знішчэнне пэўных матэрыяльных каштоўнасцяў. Перавод сінагог і малітоўных дамоў у агульнаграмадскае карыстанне, знішчэнне міквaў, закрыццё могілак рабіла немагчымым выкананне пэўных рытуальных

дзеянняў. Гэта быў адзін са шляхоў паступовай ліквідацыі матэрыяльнай культуры, а праз яе – аслаблення духоўнай складовай часткі канфесіі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Зельцер, А.*** Евреи советской провинции: Витебск и местечки 1917–1941 / А. Зельцер. – М.: РОССПЭН, 2006. – С. 237–241, 254–255.
2. ***Смиловитский, Л.*** Евреи в Турове: история местечка Мозырского Полесья / Л. Смиловитский. – Иерусалим: Tsur-Ot Press, 2008. – С. 533–535.
3. ***Фішман, Д.*** Лёс іудаізму ў савецкай Беларусі (1920–1930) / Д. Фішман // Беларусіка. – Мінск, 1995. – Кн. 4: Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння. – С. 111–117.
4. ***Кац, Г.-Д.*** Яўрэйскія могілкі на Беларусі / Г.-Д. Кац // Мишпоха. – 1996. – № 2. – С. 122–124.
5. ***Розенблюм, А.*** Деревня Черневка, где памятника нет / А. Розенблюм // Мишпоха. – 2008. – № 23. – С. 95–96.
6. ***Переписка о регистрации частных организаций, кружков, обществ, уставы их и списки членов-учредителей*** // Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Фонд 1821. – Оп. 1. – Д. 194а. – Л. 366.
7. ***Постановления Витгубфинотдела о порядке обложения налогами. Положение об охране лесов республики, протокол заседания Малого Президиума Витгубисполкома за 1924 г., переписка с Наркомфином СССР об отсрочке платежей за древесину, о подготовительных мероприятиях в связи с предстоящей денежной реформой*** // ГАВО. – Фонд 56. – Оп. 1. – Д. 264. – Л. 79–81, 84–88 об.
8. ***Дело о закрытии синагоги «Хабадка» в м. Сиротино для организации в ней пункта по военной подготовке*** // ГАВО. – Фонд 2356. – Оп. 1. – Д. 14. – Л. 1, 3–5.
9. ***Устав еврейского церковно-приходского Совета и списки членов этого Совета*** // ГАВО. – Фонд 735. – Оп. 1. – Д. 21. – Л. 7–7 об.
10. ***Директивные письма ЦК ВКП(б), ЦК КП(б)Б в адрес окружкома и окружкома райкомам КП(б)Б*** // ГАВО. – Фонд 10051-п. – Оп. 1. – Д. 585. – Л. 89.
11. ***Переписка о религиозных обществах и сведения о них*** // ГАВО. – Фонд 118. – Оп. 4. – Д. 34. – Л. 270, 306–315.
12. ***Циркуляры Наркомздрава РСФСР и переписка с городскими учреждениями о медико-санитарных мероприятиях по борьбе с эпидемиологическими заболеваниями по г. Витебску*** // ГАВО. – Фонд 64. – Оп. 1. – Д. 41. – Л. 52–53.
13. ***Приемо-сдаточные акты имущества кладбищ и других коммунальных предприятий*** // ГАВО. – Фонд 1001. – Оп. 1. – Д. 241. – Л. 81.



## *SUMMARY*

*The research is devoted to the process of liquidation of synagogues, the Jewish ritual pools and cemeteries in Vitebsk region during the period since 1918 to 1929. It was the most intensive one in large cities. The destruction of Judaic nation and spiritual culture was the purpose of such campaigns.*



*Поступила в редакцию 1.09.2009*